*Рука дапамогі*

# БРСМ ДА ВЫБАРАЎ АДКРЫЎ ГАРАЧЫЯ ЛІНІІ

## І плануе задзейнічаць падчас іх валанцёраў



**Гарачыя лініі па аказанні дапамогі маламабільным выбаршчыкам працуюць пры абласных і Мінскім гарадскім камітэтах Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

З просьбай аказаць дапамогу ў суправаджэнні людзей з абмежаванымі магчымасцямі на выбарчыя ўчасткі ў дзень выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, 18 лютага, і дні датэрміновага галасавання можна звярнуцца ў рэгіянальныя аддзяленні валанцёрскага руху БРСМ «Добрае Сэрца». Для гэтага неабходна пакінуць папярэднія заяўкі, патэлефанаваўшы па нумарах у Брэсце — 8 (0162) 21 15 92, Віцебску — 8 (0212) 66 20 87, Гомелі — 8 (0232) 60 15 57, Гродне — 8 (0152) 72 20 96, Магілёве — 8 (0222) 76 67 51 і 8 (0222) 76 64 49, Мінскай вобласці — 8 (017) 289 15 28, Мінску — 8 (017) 284 85 54. Плануецца, што гарачыя лініі будуць працаваць і пры тэрытарыяльных камітэтах БРСМ.

Акрамя таго, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі плануе задзейнічаць для дзяжурства на ўчастках падчас выбараў больш за 4,5 тысячы валанцёраў «Добрага Сэрца». Добраахвотнікі БРСМ у рамках сваёй кампетэнцыі акажуць неабходнае садзейнічанне ў перамяшчэнні інвалідаў, людзей пажылога ўзросту, маці з маленькімі дзецьмі ў калясках і іншым грамадзянам, хто мае патрэбу ў дапамозе.

Нягледзячы на тое, што вопыт работы на выбарах у валанцёраў БРСМ ёсць, Саюз моладзі выйшаў з ініцыятывай правядзення шэрагу сустрэч з грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства інвалідаў», «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» і іншымі зацікаўленымі ў арганізацыі работы добраахвотнікаў на ўчастках, у тым ліку па іх навучанні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*У ліку найлепшых*

# «ЗОАГАСЦІНІЦА» ЦІ «ШКОЛА ДАБРА»?



### На Гомельшчыне вызначалі пераможцаў абласнога этапу «100 ідэй для Беларусі»

**Чарговы абласны этап рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», які праводзіцца па ініцыятыве і пад эгідай БРСМ, вітала Гомельшчына. Яго ўдзельнікі — прадстаўнікі навуковай, студэнцкай і працоўнай моладзі, школьнікі — прадставілі ў канферэнц-зале СЭЗ «Гомель-Ратон» больш за 20 аўтарскіх праектаў — пераможцаў раённых адборачных этапаў.**

Сярод іх распрацоўка «Праграмнае і метадычнае забеспячэнне — як аснова прагназавання энергаэфектыўнасці сістэм гарадскога водазабеспячэння і водаадвядзення» аўтара Аляксея Капанскага з Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога, асістэнта кафедры электразабеспячэння. Свой праект «Зоагасцініца» прэзентавалі студэнты Віялета Кохан і Аляксандр Карповец з Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. Работу «Вырошчванне сеянцаў дуба чарэшчатага з закрытай каранёвай сістэмай» прадставіў Дзмітрый Захаранка, магістрант той жа навучальнай установы. З дабрачынным сацыяльным праектам школы падрыхтоўкі валанцёраў «Школа Дабра» прыехала на абласны этап конкурсу культарганізатар Вераніка Ражкова з Гомельскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Сімулятарам-накладкай для адпрацоўкі ўнутрывенных ін'екцый і забору крыві» здзівіў Алег Дохаў, выкладчык кафедры ваеннай і экстрэмальнай медыцыны Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, а «Аўтаматычныя вонкавыя дэфібрылятары» прадставіла Анастасія Прадко, студэнтка гэтай жа ВНУ. Былі і іншыя праекты, якія ахоплівалі ўсю сферу жыццядзейнасці.

Экспертамі выступалі кіраўнікі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ», Гомельскага тэхнапарка, Гомельскага абласнога клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, бізнес-школы ІПМ і іншыя прадстаўнікі профільных сфер і бізнес-супольнасці.

Кожнаму аўтару праекта было прапанавана за 30 секундаў прэзентаваць сваю распрацоўку, тым самым зацікавіўшы ўласнай ідэяй наведвальнікаў выстаўкі і экспертаў. У канцы мерапрыемства ім далі яшчэ адну магчымасць у рамках абароны ініцыятыў на працягу трох хвілін расказаць пра сваю задуму. Па выніках прэзентацый экспертны савет выбраў найлепшыя ініцыятывы па намінацыях, якія прадставяць Гомельскую вобласць на рэспубліканскім этапе конкурсу «100 ідэй для Беларусі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Інтэлект і інавацыі*

# МАГІСТРАЛЬ ВІТАЕ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

**Гэты конкурс праводзіцца ўжо другі раз. Ён арганізаваны з мэтай выяўлення інтэлектуальных і творчых здольнасцяў моладзі, а таксама ўкаранення на магістралі інавацыйных ідэй і праектаў, якія прадстаўляюць практычны інтарэс.**

Інтэлектуальнае спаборніцтва праводзіцца ў трох намінацыях: «Найлепшая маладзёжная ініцыятыва, скіраваная на павышэнне бяспекі руху цягнікоў, перавозкі грузаў і пасажыраў», «Найлепшая маладзёжная ініцыятыва, скіраваная на павышэнне прадукцыйнасці працы, рацыянальнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, эканомію паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў» і «Найлепшая маладзёжная ініцыятыва, скіраваная на забеспячэнне аховы навакольнага асяроддзя, а таксама на павышэнне ўзроўню тэхнікі бяспекі і аховы працы на вытворчасці».

У конкурсе могуць прыняць удзел прадстаўнікі працоўнай моладзі арганізацый і адасобленых структурных падраздзяленняў Беларускай чыгункі ва ўзросце да 31 года ўключна, а таксама навукова-вытворчых калектываў, якія складаюцца з маладых людзей ва ўзросце да 31 года ўключна.

Матэрыялы для ўдзелу ў конкурсе маладзёжных ініцыятыў неабходна прадставіць ва ўпраўленне Беларускай чыгункі не пазней за 16 лютага на папяровым і электронным носьбітах.

Маладзёжная ініцыятыва павінна змяшчаць электронную візітоўку (графічны малюнак у JPG-фармаце з разрозненнем не менш за 800x600px, які ілюструе сутнасць маладзёжнай ініцыятывы) і кароткае апісанне (мэты і задачы маладзёжнай ініцыятывы, аналіз узнятай праблемы, вынікі даследаванняў і (або) апісанне практычных распрацовак, а таксама адпаведныя дадаткі (фота- і відэаматэрыялы, графікі, табліцы, мультымедыйныя прэзентацыі і інш., аформленыя ў адвольнай форме).

Вынікі конкурсу падвядуць у сакавіку, пераможцы будуць узнагароджаны памятнымі дыпломамі і грашовымі прэміямі. Заснавальнікі творчага спаборніцтва — Беларуская чыгунка, Аб'яднаная галіновая прафсаюзная арганізацыя чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў і галіновы камітэт БРСМ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Прэч руціну!*

# Рэктарат выклікалі на... лыжню

**Звыш 500 студэнтаў Белдзяржуніверсітэта адзначылі заканчэнне зімовай сесіі і надыход канікулаў у спартыўна-аздараўленчым комплексе «Лагойск».**

Удзельнікамі маштабнай акцыі сталі таксама кіраўнікі і выкладчыкі ўніверсітэта. Усіх (і студэнтаў, і работнікаў універсітэта) чакала лыжная эстафета.

— Заканчэнне сесіі — добрая нагода напоўніць гэтую падзею яркімі эмоцыямі і ўражаннямі, а таксама карыснымі фізічнымі нагрузкамі, — падкрэсліў рэктар БДУ Андрэй Кароль. — Вельмі радуе, што і нас, сваіх настаўнікаў, студэнты запрасілі на гэтае свята.

У спартыўнай гонцы барацьба разгарнулася паміж камандамі «Рэктарат», «Дэканат», «Работнікі» і «Студэнты». Інтрыга вырашылася на карысць студэнцкай зборнай, якая фінішавала першай. Другой завяршылі эстафету прадстаўнікі «Рэктарата»: у складзе гэтай каманды выступалі рэктар БДУ Андрэй Кароль, прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях Вольга Чупрыс, прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічнай развіцці Міхаіл Чарапеннікаў і кіраўнік аддзела па рабоце з моладдзю Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы Максім Логвінаў. «Бронзу» заваявала каманда «Работнікаў».



Сюрпрызам для гасцей мерапрыемства стала сустрэча з майстрам спорту міжнароднага класа, чэмпіёнкай Еўропы, 11-разовай чэмпіёнкай свету па летнім біятлоне Вольгай Назаравай. Падчас майстар-класа спартсменка расказала пра свае перамогі, першыя медалі і спартыўную кар'еру.

У гэты дзень на пляцоўках спартыўна-аздараўленчага комплексу працавалі таксама зоны актыўнасці, дзе ўсе ахвотныя маглі праверыць свае сілы ў ціры, у барацьбе сумо, атракцыёне «вялікі футбол» і іншых. Таксама для ўдзельнікаў мерапрыемства прайшлі шматлікія розыгрышы і конкурсы.

Арганізатарам мерапрыемства выступіла Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Пацэліць у яблычак*

# «Снежны снайпер»: спаборніцтвы трапных і хуткіх

**Другі этап рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлоне сярод дзяцей і падлеткаў «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба пройдзе ў пачатку лютага.**

Першымі наймацнейшых вызначаць юныя біятланісты Брэсцкай вобласці, якія будуць спаборнічаць сёння на лыжаролернай трасе агракамбіната «Мір» у Баранавіцкім раёне. Услед за імі абласныя спаборніцтвы пройдуць у астатніх рэгіёнах краіны. У Мінску старты «Снежнага снайпера» адбудуцца 6—8 лютага на трасе ў Вяснянцы.

Рэспубліканскія спаборніцтвы «Снежны снайпер» — адзін з самых маштабных і паспяховых праектаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. З моманту свайго нараджэння ў 2007 годзе спаборніцтвы занялі лідзіруючую пазіцыю па масавасці ўдзелу сярод падобных турніраў. Толькі ў першым «Снежным снайперы» на старты выйшлі больш за 200 тысяч хлопцаў і дзяўчат з усёй краіны. У спаборніцтвах удзельнічаюць аматары біятлона, якія не адносяцца да спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў. Юныя спартсмены будуць спаборнічаць у трох узроставых групах: малодшай (11—12 гадоў), сярэдняй (13—14 гадоў) і старэйшай (15—16 гадоў). Спачатку яны выйдуць на старты ў рамках школьных, раённых і абласных этапаў «Снежнага снайпера», а самыя трапныя і хуткія будуць змагацца за ўзнагароды ў рэспубліканскім фінале.



Фота БЕЛТА.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**